**Крачкоўскі, А.** Над гарамі Афганістана / А. Крачкоўскі // Зара (Бешанковічы). — 1998. — 10 лістап. — С. 2—3.

## НАД ГАРАМІ АФГАНІСТАНА

Мінула дзесяць гадоў з той пары, калі ў росквіце жыццёвых і творчых сіл перастала біцца сэрца мужнага сына сваёй Радзімы, баявога лётчыка, нашага земляка Дзмітрыя Дзмітрыевіча Гайдукова. Аднаму Богу вядома, колькі гэта каштавала яго бацькам – Лідзіі Фёдараўне і Дзмітрыю Платонавічу. Дастаткова нагадаць, што толькі тры гады пражыў пасля смерці сына Дзмітрый Платонавіч... Хоць прайшло шмат часу, але дагэтуль не магу забыць твар Лідзіі Фёдараўны і наогул знешні выгляд жанчыны, якая ўпершыню пераступіла парог рэдакцыі, каб падзяліцца сваім страшэнным мацярынскім горам. Ён быў настолькі змучаным, што без смутку і болю нельга было глядзець на жанчыну. Яна расказала тое, што ведала, і твар быццам пасвятлеў ад таго, што хоць нязначная частачка яе ўсеагульнага перажывання перайшла да другога чалавека, з якім яна падзялілася сваім патаемным.

Падала паперку. Гэта было пісьмо камандавання верталётнай часці, дзе служыў сын – яе радасць і надзея, гора і смутак, жыццёвы працяг і да болю свая, родная крывіначка. «Паважаныя Лідзія Фёдараўна і Дзмітрый Платонавіч!, – было напісана там. – З вялікім жалем паведамляем, што, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан, Ваш сын, Гайдукоў Дзмітрый Дзмітрыевіч, загінуў 5 верасня 1988 года пры выкананні баявой задачы. Гайдукоў Д. Д. быў адданы справе Камуністычнай партыі, сацыялістычнай Радзіме, цвёрда выконваў Патрабаванні воінскай прысягі, праявіўшы ў цяжкіх умовах высокія маральныя і палітычныя якасці, прафесійнае майстэрства. Ваш сын праявіў мужнасць і адвагу, да канца выконваючы пастаўленую задачу.

Камандзіры, палітработнікі, афіцэры, прапаршчыкі, сяржанты і салдаты часці разам з Вамі глыбока смуткуюць з прычыны гібелі вернага сына Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і выказваюць спачуванне Вам, Вашым родным і блізкім з выпадку напаткаўшай Вас цяжкай страты.

Камандзір вайсковай часці падпалкоўнік Сухаплюеў, намеснік камандзіра па палітчасці падпалкоўнік Славінскі».

А чаго каштавала даведацца пра смерць мужа Любові Мікалаеўне, бацькі – яго дзеткам! Тут словамі цяжка выказаць...

Лідзія Фёдараўна прыгадала радкі біяграфіі сына. Ён нарадзіўся ў вёсцы Дубкі, што ў Рубежскім сельсавеце, у 1951 годзе. Там жа скончыў чатыры класы, у суседняй Агрыцькаўцы – сямігодку. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Рубяжы. Яго светлая мара была – стаць лётчыкам. Пра гэта добра ведалі і бацькі. Таму не пярэчылі надта, калі Дзіма падаўся ў Рыгу, дзе было лётнае вучылішча.

Першая спроба аказалася няўдалай. Праўда, ад сваёй мары юнак не адступіў. Праявіўшы сілу волі і характар, ён апынуўся ў аэраклубе, што пад Віцебскам, і, паспяхова скончыўшы яго, шчаслівы хлопец атрымлівае накіраванне ў лётнае вучылішча г. Откарска, дзе стаў вучыцца на баявога верталётчыка.

Самастойная служба пасля вучылішча пачалася для Гайдукова на Сахаліне, куды атрымаў накіраванне, потым працягвалася ў Калінінградзе. У былой нямецкай крэпасці ён «засеў» надоўга,

настолькі, што паспеў ажаніцца, атрымаць кватэру, стаць бацькам трох сыноў, мець стаж лётнай службы 14 гадоў. Афганскім небам капітан Дзмітрый Гайдукоў «захварэў» не адразу – прыглядаўся, прыслухоўваўся да ўсяго, што там адбывалася. Праўда, ад Афганістана ён быў надзейна застрахаваны – трое дзяцей. Але сэрца не вытрымала: захацелася паспрабаваць сябе ў сапраўднай справе, праверыць свае здольнасці і якасці баявога лётчыка. На рапарт Д. Гайдукова ў часці адгукнуліся хутка – добраахвотнікі ў такой справе не часта сустракаюцца! Жонцы паведаміў аб прынятым рашэнні ў апошні момант. Бацькам жа – ні слова! Навошта іх турбаваць і прымушаць перажываць лішні раз.

У Афганістан Дзмітрый Гайдукоў прыбыў 1 верасня 1987 года з кантрактам на год. Пачатак яго баявой службы ў чужой краіне, за чужыя інтарэсы ахарактарызаваўся тым, што ўжо ў першых вылетах на пазіцыі душманаў машына Гайдукова падвергнулася моцнаму кулямётнаму агню праціўніка. Верталёт тады ўдалося вывесці з-пад абстрэлу без страт, калі не лічыць раненне, якое камандзір атрымаў у жывот.

Бацькі ж першае пісьмо ад сына атрымалі з Кундуза. Датавалася яно 10 верасня 1987 года:

«Добры дзень, мае дарагія бацькі. Прыслала мне Любаша тваё, мама, пісьмо. І вось я пішу вам. Не хацеў нікога засмучаць гэтым Афганістанам, але раз жонка паведаміла ўжо, то што зробіш. Цяпер вы ўсё ведаеце. Але турбавацца зусім не трэба. У гэты час тут не ваююць – мір. Так што за мяне не хвалюйцеся. Галоўнае, мама, беражыце сябе...».

Бацькі ўбачыліся з сынам у Калінінградзе, куды ён прыляцеў на чарговае медыцынскае абследаванне ў пачатку сакавіка 1988 года. Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка сустракалі разам за святочным сталом.

13 сакавіка Дзмітрый з Любай праводзілі бацькоў дадому. Але ў чэрвені Дзмітрый знаходзіўся ў чарговым адпачынку на радзіме жонкі – у станіцы Тамань Краснадарскага краю. Туды ўжо бацькі не паехалі...

У чарговым пісьме з Афганістана Дзмітрый паведамляў бацькам аб перадыслакацыі сваёй эскадрыллі, спадзяваўся на замену ў кастрычніку-лістападзе, паколькі практычна кантракт, падпісаны на год, ужо заканчваўся.

5 верасня, калі адбыўся чарговы вылет, гадавы тэрмін службы ў Афганістане для Гайдукова скончыўся, пайшоў другі год. Камандзір вялізнага баявога верталёта ўзняўся ў паветра – у вызначаны пункт трэба было даставіць салдат. Да цэлі ўжо блізка, але раптам верталёт уздрыгануўся – у яго трапіла цеплавая ракета душманаў... Тры члены экіпажа і ўсе салдаты загінулі...

Труна Д. Д. Гайдукова была ўстаноўлена ў гарадскім Доме афіцэраў г. Калінінграда. Жалобны мітынг адбыўся і на аэрадроме, дзе служыў да Афгана наш зямляк. Ваенны самалёт даставіў труну з целам Гайдукова ў станіцу Тамань, на радзіму жонкі. Там і знайшоў саой апошні прытулак маёр, кавалер ордэна Чырвонай Зоркі, медалёў «За самаадданую службу», спецыяльнага знака «За самаадданую ратную працу ў Чырванасцяжнай Туркестанскай ваеннай акрузе» і двух медалёў «Воіну-інтэрнацыяналісту» ад афганскага народа, уручаны асабіста Прэзідэнтам Афганістана.

Пасля смерці сына бацькі пераехалі з Севастопаля ў Віцебск. Нявестка, Любоў Мікалаеўна, разам з дзецьмі перабралася ў Мінск, дзе атрымала трохпакаёвую кватэру.

Як жа далей склаўся лёс сям'і Гайдуковых?

Расказаць пра гэта папрасіў старэйшую сястру Дзмітрыя – Яўгенію Дзмітрыеўну.

– Мама жыве праз некалькі дамоў ад маёй колішняй кватэры, якую мы аддалі дзецям. Ёй нядаўна споўнілася 75 гадоў. Бацьку пахавалі ў Дубках, – паведамляе яна ў тэлефоннай размове. – Сыны майго брата, мае пляменнікі, ужо дарослыя. Старэйшаму Уладзіміру споўнілася 22 гады. Ён скончыў чыгуначнае вучылішча ў Мінску, працаваў памочнікам машыніста цеплавоза. Цяпер вучыцца ў Гомелі на машыніста. Сярэдні, 20-гадовы Дзмітрый, таксама вучыцца ў тым жа вучылішчы, толькі на слесара. Малодшаму Вадзіку толькі 17. У гэта ж чыгуначнае вучылішча марыць паступіць і ён. Так што ніхто з іх па бацькавай сцяжынцы не пайшоў. Можа, гэта і да лепшага...

Можа, і так. Яшчэ адна сястра Дзмітрыя Гайдукова, Ірына, жыве ў Севастопалі. Там праходзіў марскую службу і брат Аляксей. Апошні час ён жыў у Брэсцкай вобласці. Год назад таксама трагічна загінуў – забіла маланкай. Пахаваны, як і бацька, у Дубках. У родную вёску пераехала і Яўгенія Дзмітрыеўна разам з мужам. Працуюцьу мясцовым калгасе імя Заслонава. Добрае рашэнне, паколькі некаму ж трэба жыць на радзіме. Тут трымаюць гаспадарку, даглядаюць магілы родных.

Вось такі лёс гэтай сям'і. А яго, як вядома, не аб'едзеш, не абыдзеш. Застаецца толькі змірыцца...

**Анатоль КРАЧКОЎСКІ**